# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ВОБРАЗ КАРЧМЫ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯКУБА КОЛАСА



А. І. СМОЛІК,
доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў
Л. К. КУХТО,
кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры кулыуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў



Творчае перайманне культурнага вопыту мінулых пакаленняў з'яўляецца неабходнай умовай для плённага развіцця любой нацыянальнай супольнасці. Аснову яе самабытнасці складае культурная спадчына, у якой важным чыннікам з'яўляецца духоўны і матэрыяльны змест. За тысячагадовы перыяд гістарычнага развіцця беларускім этнасам створана багатая матэрыяльная культура, якая прадстаўлена разнастайнымі прыладамі працы, рэчамі бытавога ўжытку, адзеннем, стравамі, тэхналогіямі вытворчасці, будынкамі і інш. Сярод іх значнае месца належыць карчме, якая напачатку выконвала функцыі харчэўні, заезнага дома, дзе спыняліся, харчаваліся, бавілі час падарожныя і жыхары гарадоў і вёсак. Назва яе паходзіць ад слова «карэц» — коўш, якім зачэрпвалі спіртныя напоі.

Карчма як тып грамадскай пабудовы на Беларусі вядома з X—XI стст. У шэрагу рэгіёнаў Беларусі корчмы называлі «шынкамі», «трынкамі», «аўстэрыямі», «штофнымі лаўкамі» і інш. Аб распаўсюджаннасці корчмаў на Беларусі можна меркаваць па іх колькасці ў Вілейскім уездзе. Так, толькі ў мястэчку Лебедзева (цяпер Маладзечанскі раён) у XVII ст. на 149 двароў прыходзілася 48 корчмаў і заезных дамоў [1]. У сярэдзіне XIX ст. у г. Вілейцы было 2 719 жыхароў, 10 корчмаў і 1 вінны склеп [2, с. 48]. На пачатку XX ст. 25 корчмаў налічвалася ў Полацку [3, с. 24]. Я. Колас пры апісанні населеных пунктаў, дзе дзейнічалі яго літаратурныя персанажы, заўсёды ўпамінаў карчму.



Беларуская карчма ў вёсцы Азяркі

У мастацкай і навуковай літаратуры корчмы трактуюцца пераважна негатыўна як піцейныя ўстановы, дзе працоўны люд прапіваў грошы, у алкагольным стане завязваў сваркі, якія нярэдка заканчваліся бойкамі, нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Сапраўды, архіўныя дакументы мінулых стагоддзяў сведчаць аб тым, што ў корчмах на гулянках часам назіраліся дэвіянтныя паводзіны мяшчан і жыхароў беларускіх вёсак [4]. Якуб Колас у паэме «Сымон-музыка» таксама адзначаў негатыўныя з'явы, якія часам адбываліся ў карчме: «...Тут падчас трасуцца сцены, / Лавы крышацца, як соль. / Часта ў ход ідуць палены, / Як разыйдзецца тут голь» [5, с. 372]. Але народны паэт Беларусі ў шэрагу сваіх мастацкіх і публіцыстычных твораў паказваў і іншыя сацыяльныя, у тым ліку і сацыякультурныя, функцыі карчмы.

У XIX—XX стст. беларускія корчмы набылі сацыякультурны статус, паступова ператварыліся ў своеасаблівы этнакультурны феномен, які спалучаў у сабе традыцыі этнічнай кухні, нормы звычаёвага права, элементы народнага дойлідства, формы міжэтнічных і сацыякультурных камунікацый.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Аналіз тэкстаў і падтэкстаў навуковых і мастацкіх прац Я. Коласа дае падставу сцвярджаць, што карчму ён разглядаў адначасова як своеасаблівую інфармацыйна-камунікатыўную, рэкрэацыйную і святочную прастору вёскі, мястэчка, горада. Паказу значэння корчмаў у іх сацыяльным жыцці беларусаў, у іх светапоглядзе Я. Колас адводзіць значнае месца ў сваёй творчасці. З коласаўскіх тэкстаў бачна, што карчма мела статус «кантактнай зоны» паміж месцам сталага пражывання беларусаў і іншай (чужой) прасторай, што абумоўлівала спецыфіку яе прасторавага размяшчэння. Творца ў якасці традыцыйных месцаў функцыявання карчмы адзначаў плошчы мястэчак, гандлёвыя шляхі, рачныя пераправы, вялікія вёскі, млыны. Так, у апавяданні «Як выдумляюцца страхі» Я. Колас пісаў: «...Старая аграмадная карчма, каторых так часта можна ўбачыць яшчэ і цяпер на Палессі, стаяла на сярэдзіне дарогі з вёскі ў Сяльцо» [6, с. 266]. У шэрагу сваіх мастацкіх твораў пясняр дае дэталёвае апісанне інтэр'ера карчмы. У паэме «Сымон-музыка» паэт адзначаў: «...Дом карчомны быў вялікі, / Месца хопіць хоць каму, / А тым болей для музыкі...» [5, с. 368]. З паэмы мы даведваемся, што ў карчме Шлёмы была: «...Кухня сем на дзесяць, / Там ёсць печ, за печчу кут» [5, с. 368]. Апісанне карчмы як элемента вясковага архітэктурнага комплексу пакінуў Колас таксама ў сваёй трылогіі «На ростанях»: «...Так разважаючы, дайшоў ён да карчмы, што была пабудавана яшчэ ў даўнейшыя часы...» [7, с. 68]. У нататках «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» І паэме «Сымон-музыка», апавяданні «Ігрышча» паэт стварыў малюнкі карчомнага жыцця. Творца адзначаў, што карчма карысталася вялікай папулярнасцю насельніцтва: «...Карчма рэдка пуставала: / Чуць развідніцца — сюды / Хоць чыя душа вітала, / Шоў стары і малады» [5, с. 371].

Чым вабіла гараджан і вяскоўцаў карчма? На наш погляд, не толькі магчымасцю выпіць келіх віна і на нейкі момант забыцца на паўсядзённыя клопаты. Я. Колас падкрэслівае яе надзвычай высокі сацыякультурны статус і шырокія рытуальныя функцыі. Творца паказвае, што корчмы былі месцамі, дзе адбывалася сацыякультурная камунікацыя: «...Чаго мужык у карчму валокся? Бо там быў яго клуб, яго тэатр, яго бібліятэка. Дзе ты з суседам пабачышся, навіну пачуеш? Дзе можна параіцца, якога надвор'я чакаць на лета? Калі жывёлу ў поле выганяць, калі сеяць? Нарэшце, дзе льга хоць крыху душу павесяліць? З пана пасмяяцца, са злое долі пакпіць? Усё там жа — у карчме» [6, с. 163]. Туды прыходзілі людзі з мэтай перадачы ці абмену пэўнай інфармацыяй, падзяліцца сваімі думкамі, поглядамі на хвалюючыя пытанні. Карчма для простых людзей была ў дарэвалюцыйнай Беларусі адзіным цэнтрам грамадскага жыцця. Эліта



Варанянская карчма

грамадства мела ўласныя закрытыя інтэлектуальныя клубы, члены якіх былі аб'яднаны агульнымі інтарэсамі, захапленнямі, пэўнымі відамі дзейнасці. У гэтых клубах камунікацыя ажыццяўлялася ў спецыялізаваных галінах сацыякультурнай практыкі, мэтай якой было тварэнне і насычэнне культурнай прасторы спецыялізаванымі ведамі як у метадалагічным, так і факталагічным планах. Камунікацыя ў карчме працякала на ўзроўні паўсядзённай культуры, мела арыентацыйны характар. Стасункі гэтага тыпу дапамагалі яе наведальнікам арыентавацца ў сістэмнай структуры прыроднай і сацыяльнай прасторы, сацыялізавацца ў соцыуме, фарміравалі іх экзістэнцыяльныя і каштоўнасныя арыентацыі. Аналагічнае меркаванне аб ролі карчмы выказваў вядомы этнограф П. В. Шэйн: «...Арэнай для грамадскага жыцця служыць пераважна карчма. Яна для беларуса і біржа, і даведачная кантора, і клуб. У корчмах нашыя сяляне збіраюцца для абмеркавання розных пытанняў грамадскіх і прыватных, для заключэння рознага роду здзелак. Тут адбываецца наём работнікаў, тут абмяркоўваецца выбар службовых асоб і іншыя справы грамадскага характару» [8, с. 103]. На гэта ж звяртаў увагу І Я. Колас у апавяданні «Прапаў чалавек»: «...Каля карчмы шум І гоман, / Зык сялянскіх галасоў. /... Як рой пчол, гулі мужчыны, / Гаманілі аб зямлі, / Разбіралі ўсе навіны, / Ўсе інтэрасы вялі» [9, с. 77].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



Яўрэйская карчма

Літаратурныя тэксты коласаўскіх твораў даюць падставу сцвярджаць, што карчма была важнай святочнай прасторай беларусаў. Творца адзначаў, што ў ёй ладзіліся банкеты з рознай нагоды: «... Моладзь ладзіла ігрышча, / Людзі сталыя — банкет» [10, с. 100]. Карчму масава наведвалі на Вялікдзень, Каляды, Масленіцу і ў іншыя святы. Пісьменнік пісаў, што асаблівым попытам яна карысталася зімой, калі ў яе наведвальнікаў было больш вольнага часу: «...У карчму зімовым часам / Валам ціснуўся народ, / Забаўляўся самапасам / Дні і ночы напралёт» [10, с. 10]. У корчмах, падкрэсліваў Я. Колас, значная частка гараджан і сяльчан на аматарскім узроўні (самапасам) задавальняла сацыяльныя патрэбнасці ў вольны час. Суб'екты культуры вольнага часу знаходзілі ў карчме занятки, звязаныя са спажываннем каштоўнасцей індывідуальнага, калектыўна-відовішчнага ці публічна-відовішчнага характару. Пра гэта сведчыў П. В. Шэйн: «...На 2-гі дзень Раства Хрыстова, на Новы год... на Дзядовую нядзелю і заговіны сяляне нашыя і малыя, і вялікія, старыя... ідуць у карчму, дзе ў танцах І гульнях праводзяць усю ноч» [8, с. 104]. Безумоўна, адзначаў Я. Колас, частка наведальнікаў карчмы адпачывалі пасіўна, падтрымлівалі зносіны са знаёмымі, назіралі за забавамі. У нарысе «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» ён пісаў: «...Пойдзе іншы шчэ ўвечар у карчму і цалюсіньку ноч сядзіць, пакурвае люльку» [6, с. 285]. Паэт адзначаў таксама разнастайнасць публікі і яе заняткаў у карчме.

Аналіз функцый беларускай карчмы дазваляе меркаваць, што яна прадастаўляла асобе магчымасць задаволіць патрэбнасці ў самарэалізацыі, сама-выражэнні яе здольнасцей, індывідуальнасці, думак і пачуццяў у творчасці. Самарэалізацыя свайго ўнутранага, індывідуальна непаўторнага «я» ажыццяўлялася ў асноўным у калектыўных формах, дзе ўдзел асобнага індывіда як бы зліваўся ў адзіны працэс і вынік. Напрыклад, у карчме моладзь ладзіла масавыя святочныя гулянні, якія ў традыцыйнай культуры беларусаў называліся ігрышчамі. Зарадзіліся яны яшчэ ў дахрысціянскі перыяд і працягваюць бытаваць у адаптаваных да сучаных умоў формах. Ігрышчы з танцавальна-гульнявымі і тэатралізаванымі паказамі прымяркоўваліся да найважнейшых перыядаў у гадавым кругавароце дзён, звязаных з сонцастаяннем і раўнадзенствам. Менавіта таму яны ладзіліся часцей за ўсё зімой, вясной і летам (Каляды, Купалле, Маслянка, Радаўніца і інш.). Пазней ігрышчамі сталі называць ураджайныя святкаванні, вясковыя вечарыны шлюбна-эратычнага зместу, на якіх дэманстраваліся пераапрананні, парадзіраваныя вяселлі, шлюбна-забаўляльныя і гульнявыя тэатралізацыі. Усё гэта суправаджалася народнымі песнямі, танцамі, інструментальнай музыкай, якія належалі да старажытнага пласта беларускага каляндарна-музычнага фальклору. Асабліва насычаны песенным, тэатральным і харэаграфічным фальклорам былі калядныя і купальскія ігрышчы.

Я. Колас у паэме «Сымон-музыка», апавяданні «Ігрышча» адлюстраваў названую народную традыцыю: «...Тут ігрышчы адбываліся / Перад святамі зімой. / Танцавалі маладыя, / Весяліліся, пілі, / Для іх скокі, гульні тыя / Многа радасці нясллі» [5, с. 373]. Я. Колас у вершаваным апавяданні «Ігрышча» падкрэсліваў, што ўдзелькамі ігрышчаў была, як правіла моладзь: «...У карчомцы грук вялікі, / Гоман шумны, малады...» [10, с. 98]. Найбольш часта ў ігрышчах выкарыстоўвалася такая традыцыйная абрадава-гульнявая дзея, як «Жаніцьба Цярэшкі». Тэатралізацыя гэтага абраду разыгрывалася ў перыяд зімовага сонцавароту і супадала з пераломнымі момантамі прыроднага і жыццёвага цыклу. Дзея абапіралася на карнавальную лексіку з уласцівай ёй логікай адваротнасці. Тэатралізацыя шлюбу суправаджалася жартоўнымі спаборніцтвамі хлопцаў і дзяўчат, дзе выразна ўвасоблена апазіцыя «мужчынскае — жаночае». Дзея ўключала шэраг гульнявых этапаў, найбольш важнымі з якіх былі «перакручванне», «пералоўліванне», «застолле». Усе этапы гульні

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

функцыянальна і тэматычна звязваліся і афармляліся «цярэшкаўскімі» песнямі і танцамі. Традыцыйнымі на ігрышчах былі таксама тэатралізаваная кампазіцыя «Ваджэнне казы», карагод-гульня «Яшчур». З хлопцаў выбіраўся «яшчур», які ставіўся ў цэнтр карагода. Па правілах гульні дзяўчаты аддавалі «яшчуру» вянкі, хусткі, пярсцёнкі ці іншыя рэчы. Дзея суправаджалася адпаведнай песняй: «... Сядзі, сядзі яшчур / У гайку зялёным, / У арэхавым кусце / На залатым крэсле». Пасля кожная дзяўчына прасіла «яшчура» вярнуць ёй яе рэч. Усе астатнія спявалі песню, якая функцыянальна была звязана з гэтым этапам гульні: «...Пане яшчур, адай мой вяночак! / Мой вяночак залаты, / Загубіла з галавы. / Будзе мяне мамка біць, / Ды некаму бараніць». Хлопец вяртаў рэч, калі дзяўчына цалавала яго або выконвала якое-небудзь іншае пажаданне «яшчура». Кампазіцыя, рытміка і памер песні адпавядаў гульнявой функцыянальнасці.

Акрамя гуртавых тэатральных паказаў, адзначаў Я. Колас, на ігрышчах выконваліся народныя танцы розных гісторыка-стылявых форм. Пашыранымі ў Беларусі былі парна-гуртавыя, парныя і сольныя формы. Яны былі разнастайныя па кампазіцыі, мелі ўстойлівую і імправізацыйную структуру (ад аднаматыўных да шматкаленных). Адметнасць шматкаленных танцаў выразна паказаў пясняр у апавяданні «Ігрышча», паэме «Новая зямля» («Падгляд пчол»): «Тут і вальсы, тут і полькі, / Гоман, жарты, смех і гук» [10, с. 100]. Такое масавае мастацкае выкананне было ўласціва людзям, чые патрэбнасці ў самавыражэнні недастаткова ярка выражаны, узровень здольнасцей і магчымасцей якіх не выклікаў імкнення вылучыцца сярод іншых. У той жа час Я. Колас паказаў, што ў корчмах высокаразвітая асоба мела магчымасць паказаць сваё адметнае індывідуальнае самавыражэнне ў культурнай дзейнасці і ўключалася альбо ў камерныя, альбо ў аўтарскія віды творчасці. Так, творца сярод танцуючых у карчме выдзяліў дуэт мужчын, якi выконваў народны танец «Каваль»: «...То адзін, то другі / Плечуком ускіне, / Рукі іх — лук тугі, / І пастава іх нагі / У належным чыне» [10, с. 101]. Незвычайны талент вясковага музыкі самародка раскрыў Колас у паэме «Сымон-музыка». Наведвальнікі карчмы Шлёмы «...выхвалялі яго ўсяк: / Чый ён, жэўжык? Ось музыка! / Ось, псякроў яго, мастак!» [5, с. 372]. Я. Колас зафіксаваў той факт, што выкананне песен і танцаў на ігрышчах адбывалася пад акампанімент музычных інструментальных ансамбляў. Творца ў сваім апавяданні апісаў ансамбль, у якім ігралі на трох відах народных інструментаў: «Скрыпка ж голасна звініць, / Ну, дзівота, як жывая, / От, здаецца, гаманіць...», «І басэтля безупынку / Ўсё раве і ўсё раве...», «Рэпіць дудка, не даецца, / Адатне ды зноў пачне» [10, с. 99].



Літоўская яўрэйская карчма

Пісьменнік адзначаў, што ў корчмах масава адзначаліся не толькі ігрышчы, народныя і рэлігійныя святы. Карчма была абавязковым кампанентам сямейнага жыцця. Практычна ніводная сямейная ўрачыстасць не абыходзілася без карчмы. У ёй жаніх знаёміўся з нявестай. Сюды заязджалі адразу пасля вянчання, пасля хрышчэння дзіцяці і пасля пахавання.

Я. Колас меркаваў, што карчма выконвала таксама кампенсацыйную функцыю. У беларускім грамадстве было дастаткова фактараў, якія выклікалі нестандартныя фізіялагічныя, псіхічныя і псіха- эмацыянальныя рэакцыі ў пэўнай групы насельніцтва. Сяляне часта неслі страты ў сваёй гаспадарцы, не маглі своечасова заплаціць падаткі, мелі праблемы з мясцовымі органамі ўлады і г. д. Горад спараджаў яшчэ больш стрэсавых сітуацый, якія выклікалі ў мяшчан стан псіхічнай напружанасці. Каб пераадолець узбуджэнне, напружанасць, людзі часта ішлі ў карчму. Колас у вершы «Панас гуляе» дакладна прымеціў гэты аспект: «...Напляваць мне на падатак. / Што мне земскі старшына! / Хаім, люльку на ў задатак, — / Дай мне царскага віна» [9, с. 127]. У шэрагу сваіх апавяданняў пісьменнік адзначаў, што плытагоны, якія паспяхова праходзілі рыфы на р. Нёман, каб зняць стрэсавы стан, заходзілі ў карчму. Дарэчы яна размяшчалася на ўзгорку, дзе заканчваліся рыфы. Такім чынам, карчма прадстаўляла пэўнай катэгорыі людзей розныя формы духоўнай і псіхалагічнай разрадкі, ухіленне ад рэальных цяжкасцей і адпачынак ад жыццёвых праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



**Ля беларускай карчмы**

Гісторыка-кулыурная рэканструкцыя коласаўскіх мастацкіх тэкстаў дазваляе меркаваць, што карчма ўспрымалася народным паэтам Беларусі як своеасаблівы поліфункцыянальны сацыякультурны інстытут. Яна прадстаўляла асобе магчымасць задаволіць патрэбнасці ў самарэалізацыі, сама-выражэнні яе здольнасцей, індывідуальнасці, думак і пачуццяў у творчасці з выкарастаннем песенных, музычна-харэаграфічных, абрадавых дзей і гульні. Самарэалізацыя свайго ўнутранага, індывідуальна непаўторнага «я» ажыццяўлялася ў асноўным у калектыўных формах, дзе ўдзел асобнага індывіда як бы зліваўся ў адзіны працэс і вынік. У нашы дні адбываецца рэвіталізацыя адпачынкавых установ, якія маюць назву «карчма». Яны існуюць у Мінску, абласных і раённых цэнтрах. У шэрагу з іх аднаўляецца традыцыйны інтэр'ер, гасцей частуюць народнымі беларускімі стравамі. У моладзі, як і ў мінулыя часы, такія ўстановы карыстаюцца попытам. Пры адраджэнні лепшых традыцый карчмы каштоўнасць уяўляе творчая спадчына Я. Коласа, у якой увасоблены вопыт арганізацыі вольнага часу ў карчме.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Інвентарь г. Гродно 1712 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — КФМ 19. — Воп. 2. — Спр. 1.
2. *Костенко, В. М.* Корчмы в книге К. Тышкевича «Вилия и её берега» / В. М. Костенко, М. М. Михалевич // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастрычніка 2009 г.): матэрыялы чытанняў / рэд.: А. І. Смолік (адк. рэд.) і інш. — Мінск : Бел. Дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. — 109 с.
3. *Даражкоўскі, С. Л.* Аб'екты грамадскага харчавання ў гарадской інфраструктуры Полацка канца XIX — пачатку XX стст. / С. Л. Даражкоўскі // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навуковадаследчай работы ў 2007 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. — Полацк : НПГКМЗ, 2008. — 120 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 295. — Воп. 835. — Л. 2—3.
5. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. Том 6. Паэмы «Новая зямля, «Сымон-музыка» / Я. Колас. — Мінск : « Мает, літ.», 1974. — 624 с.
6. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. Том 4. Апавяданні 1906—1917 гг. / Я. Колас. — Мінск : «Мает, літ.», 1973. — 352 с.
7. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. Том 9. Трылогія «На ростанях» / Я. Колас. — Мінск : «Мает, літ.», 1975. — 800 с.
8. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, собр. и при- вед. в порядок П. В. Шейном. Т. 3 / П. В. Шейн. — СПб. : Тип. Имп. Акад. Наук, 1893. — 716 с.
9. *Колас, Я.* Збор. твораў: у 14 т. Том 1. Вершы 1898— 1917 гг. / Я. Колас. — Мінск : « Мает, літ.», 1972. — 562 с.
10. *Колас, Я.* Збор. твораў: у 14 т. Том 3. Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі, паэмы для дзяцей і народныя казкі ў апрацоўцы Я. Коласа / Я. Колас. — Мінск : « Мает, літ.», 1973. — 408 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ